9. ГАБр. – Ф. 5. Оп. 1. Д. 899, 946, 5469–5910; Ф. 10. Оп. 1. Д. 1, 249; Ф. 37. Оп. 1. Д. 197а и др.
10. ГАБр. – Ф. 10. Оп. 1. Д. 16, 193; Ф. 11. Оп. 2. Д. 27; Ф. 12. Оп. 2. Д. 2а; Ф. 14. Оп. 1. Д. 7а; Ф. 2018. Оп. 1. Д. 106, 186 и др.
11. ГАБр. – Ф. 10. Оп. 1. Д. 189; Ф. 15. Оп. 1. Д. 29 и др.
12. ГАБр. – Ф. 5. Оп. 1. Д. 1356, 1936; Ф. 2005. Оп. 1. Д. 1204–1223 и др.
13. ГАБр. – Ф. 5. Оп. 1. Д. 1377–1408; Ф. 2005. Оп. 1. Д. 1224 и др.
14. ГАБр. – Ф. 5. Оп. 1. Д. 227, 857; Ф. 10. Оп. 1. Д. 54; Ф. 2005. Оп. 1. Д. 446, 449–459 и др.
15. ГАБр. – Ф. 5. Оп. 1. Д. 2490–5106 и др.
16. ГАБр. – Ф. 5. Оп. 1. Д. 520, 5408-5413; Ф. 14. Оп. 2. Д. 26; Ф. 2018. Оп. 1. Д. 113 и др.
17. ГАБр. – Ф. 5. Оп. 1. Д. 467, 1437-1439; Ф. 6. Оп. 1. Д. 205; Ф. 17. Оп. 1. Д. 50; Ф. 18. Оп. 1. Д. 46 и др.
18. ГАБр. – Ф. 5. Оп. 1. Д. 1061-1071, 1100; Ф. 10. Оп. 1. Д. 413; Ф. 11. Оп. 1. Д. 59; Ф. 49. Оп. 1. Д. 4; Ф. 2005. Оп. 1. Д. 1346–1385 и др.
19. ГАБр. – Ф. 5. Оп. 1. Д. 369, 843; Ф. 6. Оп. 1. Д. 48; Ф. 10. Оп. 1. Д. 140; Ф. 37. Оп. 1. Д. 19 и др.
20. Карапузова, А. Г. Органы местного управления и самоуправления на территории Западной Беларуси в 1919–1930-е гг. (по материалам Государственного архива Брестской области) / А. Г. Карапузова // Беларускі археаграфічны штогоднік. – 2009. – Вып. 10 – С. 65–76.

**Яшчанка А.Р.**

## МАТЭРЫЯЛЫ ГАЗЕТЫ «ЗАРА» ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ КУЛЬТУРЫ І ПОБЫТУ ГАРАДЖАН ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ НАПЯРЭДАДНІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Матэрыялы перыядычнага друку належаць да каштоўных крыніц для аднаўлення гісторыі і культуры гарадскога жыцця на Беларусі ў розныя гістарычныя эпохі. Высокая актуальнасць характэрна для вывучэння праблем штодзённасці перадваеннага часу, асабліва ў дачыненні гарадоў Заходняй Беларусі, дзе перапляталіся трывалыя асновы гарадской цывілізацыі з прыўнясеннем прынцыпова іншых, савецкіх па сваёй сутнасці, тэндэнцый культурна-побытавага развіцця. Гэтыя працэсы напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ўскладняліся поліэтнічным складам гарадскіх жыхароў, рэлігійнасцю насельніцтва і, у цэлым, спецыфікай разгортвання ўрбанізацыйных працэсаў у Заходняй Беларусі ў першыя дзесяцігоддзі ХХ ст.

У гістарыяграфіі беларускай этналогіі вызначаны сюжэт амаль не раскрыты. Пытанне аб культуры і побыце гараджан Заходняй Беларусі з пазіцый савецкай метадалогіі закранался ў калектыўных манаграфіях беларускіх савецкіх этнографаў, напрыклад, «Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі» [6], аднак у якасці самастойнага прадмета для характарыстыкі ў межах сучасных этналагічных даследаванняў яно адсутнічае. Перыядычны друк таксама неаднаразова выкарыстоўваўся як крыніца інфармацыі для апісання гістарычных падзей і працэсаў у БССР, аднак з пункту гледжання рэканструкцыі побытавай культуры гарадскога насельніцтва заходняй частцы БССР заставаўся малавывучанай крыніцай.

Звернемся да матэрыялаў газеты «Зара», якая выходзіла ў Валкавыску як орган Укома КП(б)Б і Увыканкома Валкавыскага павета(далей: Валкавыскага РК КП(б)Б і РВК). Яе першыя 24 нумары пабачылі свет у 1939 г., але найбольшую каштоўнасць уяўляюць нататкі і афармленне экземпляраў за 1940 год, калі ўкараненне савецкага кампанента ва ўсе сферы жыцця, у тым ліку сферу культуры і побыту, праявілася больш рэльефна. Гэтае выданне выбрана для разгляду яшчэ і таму, што яно належыць да рэгіянальных газет, публікацыі на іх старонках эфектна і рознабакова адлюстроўвалі не толькі мясцовы гарадскі каларыт, але і панараму сацыякультурнага развіцця гарадоў усяго краю. Акрамя інфармацыі пра агульнадзяржаўныя падзеі, сельскае жыццё свайго павета, пра сітуацыю ва ўласна Валкавыску, часцей прадстаўляліся звесткі пра такія гарады, як Гродна, Беласток. Вобраз эвалюцыі і трансфармацыі гарадскога ладу жыцця ў Валкавыску атрымліваецца найбольш насычаным, рознапланавым, што павышае каштоўнасць газеты «Зара» як крыніцы з прычыны магчымасці прасачыць ў дэталях традыцыі правінцыяльных гараджан Беларусі. Комплекс нумароў газеты за 1940 год захаваўся ў дастатковай ступені, адсутнічаюць толькі асобныя нумары. Паліграфічная якасць высокая для тэхнічных магчымасцей даваеннага перыяду. Прозвішчы аўтараў артыкулаў і колонак навін згодна падыходам свайго часу ў большасці публікацый не друкаваліся. Выданне рыхтавалася на беларускай мове.

Сярод тэкстаў можна ўмоўна выдзяліць некалькі тэматычных груп. Першая вялізная па колькасці прыкладаў – навіны аб культурным жыцці гараджан, аб'явы аб забаўляльных і асветніцкіх мерапрыемствах. Яшчэ адна група газетных публікацый – гэта лаканічныя апісанні адбыўшыхся падзей. Пастаянна размяшчаліся аб'явы рознага кшталту, пераважна запрашэнні да навучання ў розных установах адукацыі. Газета паведамляла аб змяненнях у гарадскім асяроддзі, азеляненні, добраўпарадкаванні зон адпачынку. Радзей прадстаўлялася інфармацыя

Рэпазіторый ВДУ

пра якасць працы сферы побытавага абслугоўвання. Прыкладамі публікацый гэтага блока з'яўляюцца артыкулы аб забеспячэнні палівам школьных устаноў, дзейнасці сталовых і магазінаў, цырульняў, лазняў горада [8, с. 4].

Ступень дакладнасці фактаў даволі высокая, паколькі яны складаліся мясцовымі журналістамі, якія добра ведалі абстаноўку ў горадзе, стваралі свае артыкулы і кароткія нататкі, будучы сведкамі адбываўшыхся падзей. Акрамя таго, сфера побыту была менш зручная для першых эксперыментаў савецкіх ідэолагаў пасля далучэння гарадоў Заходняй часткі Беларусі да БССР. Разам з тым відавочны і многія скажэнні рэчаіснасці на старонках газеты, аднабаковы погляд на штодзённыя праблемы, ігнараванне шэрагу негатыўных з'яў, калі яны былі звязаныя з новай савецкай старонкай жыцця ў гарадах. Тэндэнцыйнасць у дачыненні да побытавых сюжэтаў праяўлялася перш за ўсё ў бязмежным ўхваленні і перабольшванні самых малых дасягненняў савецкай улады ва ўдасканаленні побыту, спробах уздыму культуры. Параўнанні з мінулым прыводзіліся сістэматычна і толькі адносна тых працэсаў, якія выглядалі адназначна лепш за перыяд «панскай Польшчы».

Надзвычай арыгінальнай і багатай па змесце крыніцай з'яўляюцца фотаздымкі, размешчаныя ў многіх нумарах газеты «Зара». Якасць фотаматэрыялаў розная, у большасці выпадкаў дастатковая для больш дэталёвага разгляду нават пры невялікім фармаце фотавыяў (гэтакія сустракаюцца часцей). Фота яскрава адлюстроўваюць знешняе аблічча гарадоў – Валкавыска і Беластока, віды вуліц, культурных збудаванняў, яны таксама зафіксавалі партрэты вядомых гараджан або групы асобных прадстаўнікоў гарадскога соцыума – настаўнікаў, навучэнцаў, працоўных. Некаторыя фотарэпартажы задакументавалі адметныя падзеі ў гарадах – адкрыццё і функцыянаванне культурна-асветных устаноў (бібліятэк, чытальняў, школ), а таксама прадпрыемстваў. На фотаздымках можна разгледзець табачную фабрыку ў Гродна і фрагмент гарадской вуліцы, цэнтральныя кварталы Беластока, выкладчыкаў і студэнтаў педагагічнага вучылішча ў гэтым горадзе і інш. Гараджане Заходняй Беларусі актыўна ўцягваліся ў культурныя сувязі ў межах вялікай савецкай краіны. Пачэснае месца адводзілася паказу і папулярызацыі Мінска як сталіцы рэспублікі (напрыклад, фотавыява працы бібліятэкі адной з сярэдніх школ, від Ленінградскай вуліцы), з гэтай жа мэтай даводзілася інфармацыя і фотарэпартажы аб дзейнасці павільёна Беларускай ССР на Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве. Восенню ў Валкавыску адбыліся гастролі Дзяржаўнага Кабардзіна-Балкарскага ансамбля пляскі і музыкі [7, с. 4], ён таксама даваў канцэрты ў Баранавічах, Слоніме, Брэсце і Беластоку.

Трэба падкрэсліць часта прымусовы характар увядзення некаторых новых форм у культурна-побытавую сферу гарадоў Беларусі. Адным з фактараў захавання значных пластоў побытавай культуры папярэдняй эпохі быў вельмі кароткі тэрмін жыцця гараджан у новых рэаліях, газета выходзіла ў свет у канцы пераломнага 1939 г. і ў 1940 г.

Сярод навацый у сферы дасуга, якія дастаткова гарманічна ўпісаліся ў новы культурны ландшафт, варта адзначыць заняткі ў тэхнічных гуртках, што тлумачыцца агульнымі тэндэнцыямі навуковага прагрэсу і паляпшэннем тэхнічнага забеспячэння жыцця ў гарадах Еўропы. Адносна лёгка былі перанесены ў новы фармат жыцця такія папулярныя і масавыя формы правядзення вольнага часу як наведванні кінасеансаў і заняткі ў музычна-драматычных гуртках, характэрная да папярэдніх часоў прыхільнасць да гулянняў на адкрытым паветры, музіцыраванне ў сямейным і сяброўскім атачэнні. Газета адлюстравала цікавыя для гараджан гастролі ў Валкавыску абласнога цырка шапіто з Баранавічаў летам 1940 г. [5, с. 4]. Газетныя аб'явы сведчаць аб наладжванні масавых гулянняў у гарадскіх парках, напрыклад, у Дзень чыгуначніка [8, с. 4]. Зафіксаваны і навіны аб паказе ў Валкавыску поўнага варыянта знакамітай савецкай кінастужкі «Вясёлыя рабята» [3, с. 4]. Яе дэманстрацыя на працягу двух дзён у Валкавыску адбывалася ў перапоўненай зале кінатэатра, кожны кадр суправаджаўся хохатам і апладысментамі гледачоў, летам 1940 г. упершыню лента была паказана без купюр (у ранейшых паказах ў час уваходжання горада ў Польскую дзяржаву меліся выразаныя вострыя сюжэты).

Асобную нішу займала цікавасць гараджан да прыродазнаўчых гурткоў, якія, як і вучнёўскія экскурсіі на прыроду, атрымалі шырокую папулярнасць яшчэ ў канцы XIX – пачатку XX ст. Гэтыя сімпатыі да пазнання прыроды і захавання зеляніны ў гарадской прасторы заставаліся трывалымі і ў час уваходжання гарадоў Заходняй Беларусі ў склад Польскай дзяржавы, і падтрымліваліся савецкімі ўладамі. «Горад Валкавыск прымае ўсё больш прыгажэйшы выгляд. У цэнтры горада на многіх вуліцах прыводзяцца ў парадак кветкавыя клумбы. Многія з іх ужо

Рэпазіторый ВДУ

добра ўпарадкаваны і на іх пасаджаны кветкі, якія ўжо пачынаюць цвісці» [9, с. 4]. На старонках выдання «Зара» гараджане знаходзілі інфармацыю аб цудоўных кутках прыроды Беларусі, яскравым прыкладам выступае разгорнуты артыкул, прысвечаны Белавежскай пушчы [2, с. 2]. Да новых форм адпачынку належала арганізацыя піянерскіх лагераў для гарадскіх дзяцей у лепшых прыродных мясцінах, гульняў на прыродзе.

На дзяржаўным узроўні развівалася сфарміраваўшаяся раней традыцыя заняткаў рознымі відамі спорту. У пэўнай ступені гэта дыктавалася ўмовамі ваенізацыі ў СССР у перыяд разгортвання Другой Сусветнай вайны. Пра гэта сведчаць артыкулы аб увядзенні ў строй стадыёнаў у Валкавыску, правядзенні дзён фізкультурніка. Звернемся да паведамлення аб адкрыцці стадыёна ў горадзе 1 мая 1940 г.: «Плашчадка стадыёна прыведзена ў парадак. Раней пустое поле зараз убрана ў зелень, лозунгі, плакаты. На плошчы ў 18 га распалажылася плашчадка. Фізкультурнікі горада правядуць у дзень Першае Мая першыя ў гэтым годзе спартыўныя спаборніцтвы» [1, с. 4]. Таксама на стадыёне 1 мая адбыўся парад, у далейшым яго планавалася выкарыстоўваць для развіцця розных відаў спорту. Аднак час ад часу гараджане абыякава і апатычна ставіліся да ўдзелу ў масавых мерапрыемствах, з гэтай прычыны і нізкага ўзроўню арганізацыі некаторыя фізкультурныя святы зрываліся, што адлюстравана ў публікацыі «Фізкультура па-Валкавыску» [10, с. 4].

Нягледзячы на жорсткі ідэалагічны кантроль і шматлікія прапагандысцкія штампы, якія насычалі старонкі перыядычных выданняў БССР напярэдадні Другой Сусветнай вайны, вызначаныя друкаваныя крыніцы надзвычай багатыя для рэканструкцыі працэсаў урбанізацыі ў рэспубліцы і характарыстыкі штодзённасці гарадскіх жыхароў. Прааналізаваныя матрыялы газеты «Зара» (1940 г.) сведчаць аб далейшым развіцці гарадскога ладу жыцця ў гарадах Заходняй Беларусі на падставе культурных традыцый, склаўшыхся ў міжваенны перыяд, пры актыўным укараненні навацый, абумоўленых уваходжаннем у сістэму савецкай культуры і грамадскіх адносін.


1. Адкрыўся гарадскі стадыён // Зара. – 1940. – 1 мая.
2. Белавежская пушча // Зара. – 1940. – 21 ліп.
3. Вялікая папулярнасць кінофільма «Вяселыя рабята» // Зара. – 1940. – 4 ліп.
4. Добра абслугоўваць насельніцтва // Зара. – 1940. – 8 верас.
5. Гастролі абласнога цырка // Зара. – 1940. – 26 чэрв.
6. Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі / В. К. Бандарчык [і інш.] ; пад рэд. В. К. Бандарчыка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 248 с.
7. Дзяржаўны Кабардзіна-Балкарскі ансамбль пляскі і музыкі ў Валкавыску // Зара. – 1940. – 24 ноябр.
8. Масавые гулянне ў парку чыгуначнікаў // Зара. – 1940. – 4 жніўн.
9. Упрыгожанне горада // Зара. – 1940. – 1 мая.
10. Фізкультура па-Валкавыску // Зара. – 1940. – 25 ліп.



**Гребень Е.А.**


## ГРАЖДАНСКОЕ НАСЕЛЕНИЕ БЕЛАРУСИ В УСЛОВИЯХ НАЦИСТСКОЙ ОККУПАЦИИ: ИСТОЧНИКИ И ИХ РЕПРЕЗЕНТАТИВНОСТЬ

В 1990–2000-х гг. была значительно расширена база источников по истории нацистской оккупации Беларуси. Было опубликовано значительное количество сборников, содержащих документы, ранее не доступные исследователям, в частности, документы немецкой оккупационной и местной вспомогательной администрации, характеризующие принудительный труд населения Беларуси в условиях оккупации, политику геноцида и Холокоста нацистов на территории оккупированной Беларуси [1, 17, 23–26]. Усилиями архивных работников и исследователей созданы справочные издания о местах принудительного содержания гражданского населения и военнопленных, карательных экспедициях немецких оккупантов в Беларуси [10, 12–14, 18, 21]. Ряд сборников документов характеризуют события периода Великой Отечественной войны на примере конкретного региона [3, 6, 7, 15]. Расширению базы источников, характеризующих нацистскую оккупационную политику, способствовало введение в научный оборот В.К. Коршуком и Р.П. Платоновым «Стенограммы совещания высшего руководства генерального округа «Белоруссия», Минск, 8–10 апреля 1943 года, (полностью опубликована в 2006 г. С.В. Жумарем, С.Е. Новиковым, Р.А. Черноглазовой) [2, 22]. Указанные издания содержат в основном документы высших органов немецкой оккупационной администрации, исключительно полно



Репозиторий ВГУ